Фотагалерэя

Згодна з традыцыяй нашых продкаў, апошні тыдзень Карнавалу павінен быць найбольш радасным і багатым на розныя забавы, прысмакі, бо наперадзе чакае Вялікі пост. Даўней, напярэдадні Пепельнай Серады закідвалі цымбылы, скрыпку, гармонік дзесьці на шафу, каб пасля саракадзённага посту з большай радасцю ізноў танцаваць, спяваць.

У нашы часы адноўлена традыцыя праваслаўнай Масленіцы, калі па ўсіх гарадах і мястэчках збіраюць людзей на традыцыйнае прадстаўленне. А вось католікі Лучая штогод маюць магчымасць паўдзельнічаць у заканчэнні Карнавалу: звычайна адбываецца пасля святой Імшы імпрэза з удзелам таленавітых артыстаў, паэтаў. Сёлета пробашч Лучая вырашыў зрабіць заканчэнне Карнавалу запамінальным не толькі для сваіх парафіянаў. Па яго ініцыятыве быў арганізаваны канцэрт з удзелам хрысціянскага гурта "Laudans" і арт-групы "Беларусы" з Мінска. Адбывалася імпрэза ў пастаўским Доме культуры. Гледачамі сталі, не толькі жыхары горада, але і парафій Пастаўшчыны. Не адмовіліся ад запрашэння і пастаянныя ўдзельнікі лучайскіх святаў – землякі ксяндза Мікалая з Шаркаўшчыны. На святе прысутнічалі таксама і святары: ксёндз дэкан Павел Самсонаў з Дунілавічаў, ксёндз Анджэй Бульчак з Паставаў.

Roland

26/02/201